час спірытам звярнуцца менавіта да сцэны, дзе для выкліку духаў ёсць дапаможныя сродкі", — заўважаў рэцэнзент "Мінскіх губернскіх ведамасцей".

Афішы, якія былі расклеены ў гарадах у той час, даюць нам інфармацыю аб тым, што паяўляюцца разнастайныя "музеумы" і кабінеты, дзе дэманструюць фізічныя вопыты, паказваюць фокусы, "магію" і "аптычныя карцінкі".

У канцы XIX ст. вандроўныя цыркі прыязджаюць не толькі ў такія гарады, як Мінск, Гродна, Магілёў, але і ў такія невялікія мястэчкі, як Гомель, Слонім, Рагачоў, Слуцк, Мазыр. Трупы прывозілі з сабой так званыя "шапіто" (круглыя брызентавыя палаткі на слупах) і ўстанаўлівалі іх на плошчах, дзе праходзілі кірмашы. Зімою ў "шапіто" было вельмі холадна, і гледачы сядзелі апранутыя. Часта для выступленняў наймалі памяшканні тэатраў, прыстасоўвалі манежы, гаспадарчыя памяшканні.

Такім чынам, цыркавое мастацтва ў Беларусі ў XIX ст., атрымаўшы далейшае сваё развіццё на шматлікіх кірмашах, а таксама ў спецыяльна адведзеных месцах у гарадах, становіцца вельмі распаўсюджаным і паступова набывае статус прафесійнага.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

**Макарэй С.В.,**
*аспірант кафедры сацыялогіі і культуразнаўства*

## ЛІРНІЦТВА ЯК СПЕЦЫФІЧНАЯ З'ЯВА БЕЛАРУСКАЙ КУЛЬТУРЫ

Вывучэнне такой з'явы народнай духоўнай культуры, як лірніцтва, пачалося параўнальна нядаўна. Вядома, што з XIX ст. абуджаецца вялікая цікавасць да народнай спадчыны. Менавіта ў гэты перыяд пачынаецца сістэматычны збор фальклору і этнаграфічнага матэрыялу

і іх вывучэнне. Першапачаткова цікавасць этнографаў і філолагаў, прадстаўнікоў пануючай да сярэдзіны XIX ст. міфалагічнай школы, да народнай рэлігіі, народнага светапогляду, міфалогіі і фальклору ў асноўным абмяжоўвалася фіксацыяй і апісаннем вышэйпералічаных праяў сацыяльна-культурнага жыцця.

Пачынаючы з канца XIX ст., у вывучэнні фальклорна-этнаграфічнай спадчыны адбываецца хуткая змена навуковых школ, метадаў даследавання: гістарычная школа (У.Мілер), дыфузіянізм (ці школа Т.Бенфея), параўнальна-гістарычная школа (А.Весялоўскі), эвалюцыйная, геаграфічная. Але такая разнастайнасць падыходаў да вывучэння народнай спадчыны не абазначала іх несумяшчальнасці ці ўзаемавыключэння, хаця яны і не аднародныя па сваёй накіраванасці: першыя тры школы (а таксама міфалагічная) займаліся ў асноўным высвятленнем паходжання ўзораў фальклору, астатнія засяродзіліся на метадах даследавання сабранага фальклорна-этнаграфічнага матэрыялу. Менавіта ў такіх варунках у 2-й палове XIX — пачатку XX стагоддзя ўзрастае цікавасць навукоўцаў да такой з'явы рэлігійнага народнага жыцця, як лірніцтва. Публікацыі гэтага перыяду і даюць нам сёння магчымасць даследаваць азначаны пласт духоўнай культуры беларускага народа, па-новаму зірнуць на феномен лірніцтва ў рэчышчы сацыяльна-культурных працэсаў.

Працы, якія былі апублікаваны ў гэты час,— неацэнная крыніца для даследчыкаў гісторыі культуры Беларусі. Асобнае месца ў шэрагу публікацый па азначанай тэме займае двухтомнік П.Бяссонава "Калики перехожие" (М., 1861—1864, т. 1—2, вып. 1—6), які пры ўсіх сваіх недахопах усё ж такі самы поўны з тых збораў духоўных вершаў, што ёсць. Акрамя гэтага, рэпертуар носьбітаў рэлігійнага фальклору зафіксаваны ў публікацыях П.Шэйна, Е.Раманава, Я.Карскага і інш. Захаваліся і матэрыялы, якія апісваюць побытавы бок жыцця старцаў.

Сабраць іх было вельмі складана. Прычына таму — амаль закрытае карпаратыўнае жыццё гэтага сацыяльнага слою, пранікнуць у якое пабочнаму чалавеку было вельмі цяжка. Перашкаджала і існаванне адмысловай лірніцкай гаворкі. У гэтай сувязі ўзрастае каштоўнасць прац такіх навукоўцаў, як М.Нікіфароўскі, Е.Раманаў, Я.Ляцкі, С.Максімаў, А.Грузінскі і інш.

У 20—30-я гады XX ст. адбываецца значны спад цікавасці не толькі да вывучэння гэтай асобнай з'явы, але і да народнай культуры ўвогуле. І не выпадкова. Час рэвалюцый, войнаў і іншых грамадска-палітычных з'яў, калі ад імя народа разбуралася ўсё, што захоўвала народны дух, рэлігію і культуру, не мог прайсці бясследна. З публікацый гэтага перыяду асабліва хочацца вылучыць працу Г.Фядотава "Стихи духовные (русская народная вера по духовным стихам)", першае выданне якой убачыла свет у Парыжы ў 1935 годзе.

Айчынныя фалькларысты, этнографы, культуразнаўцы не далі пакуль належнай ацэнкі такой сацыякультурнай з'яве, як лірніцтва, і за апошнія дзесяцігоддзі, на жаль, нельга вылучыць хаця б аднаго грунтоўнага даследавання па гэтай тэме. Можна адшукаць толькі канстатацыю факта існавання такой маргінальнай субкультуры ў дакастрычніцкі час, і не болей. Мабыць, на тое былі свае прычыны.

Па-першае, гэта дзесяцігоддзі ваяўнічага атэізму і непапулярнасць у сувязі з гэтым тэм, якія нават ускосна тычыліся б хрысціянства. Сюды ж можна аднесці і малую дасведчанасць шырокіх колаў грамадства ў сферы рэлігійна-духоўнага жыцця.

Па-другое, разгляд старцаў як маргінальнага слою ў сацыяльнай структуры вясковага насельніцтва, мабыць, не даваў дастатковай глебы для зацікаўленасці навукоўцаў шматграннай культурай носьбітаў народнай веры, тым больш, што іх рэпертуар, па словах Г.Фядотава, бытаваў "не ў шырокіх народных масах, падобна казцы ці

прымаўцы". Але менавіта маргіналізацыя ў апошнія дзесяцігоддзі існавання гэтай самабытнай субкультуры, у шэрагу з іншымі прычынамі, і прывяла да яе хуткага заняпаду, а потым і знікнення. І сапраўды, у канцы XIX ст. Е.Раманаў адзначае, што "... маральнае аблічча жабракоў у большасці выпадкаў, на жаль, было непрывабнае. Да агульнавядомай жабрацкай сквапнасці, упартасці і азлобленасці, якія выклікаліся хутчэй пастаяннымі нягодамі і таму больш ці менш выбачальныя, апошнім часам далучыліся і такія непажаданыя рысы, як надзвычайнае нахабства, якое даходзіць амаль да адмаўлення ўсялякіх аўтарытэтаў, п'янства за кошт міласціны, і як вынік яго — крадзеж і распуста..." Такі стан спраў Раманаў тлумачыць "агульнымі зменамі нораваў на вёсцы", а таксама "зліквідаваннем старацкага самакіравання, якое прыйшло з глыбокай старажытнасці разам са старацкай мовай". Былі і іншыя прычыны такога становішча. Безумоўна, нельга адмаўляць у маргінальнасці гэтай сацыяльнай групе, але разам з тым нельга адмаўляцца і ад маральных, этычных, культурных каштоўнасцей, што захавалі на працягу стагоддзяў яе лепшыя прадстаўнікі.

Па-трэцяе, такое становішча з вывучэннем лірніцкай спадчыны тлумачыцца яшчэ і тым, што разглядаць яе можна толькі сумеснымі намаганнямі філолагаў і этнографаў, фалькларыстаў і тэолагаў. Справа ў тым, што, напрыклад, рэпертуар старцаў не ёсць уласна фальклор. Вялікая колькасць духоўных вершаў мае свае аналагі ў пісьмовых крыніцах. "Гэта, — адзначае А.Карнееў, — у большасці сваёй апакрыфічныя паданні, жыціі святых (як кананічныя, так і апакрыфічныя), пралог, чэцці-мінеі, некаторыя павучэнні айцоў /царквы.— С.М./, эсхаталагічныя паданні і да таго падобныя творы..."

Але гэта не значыць, што дадзеныя творы не павінны разглядацца фалькларыстамі, бо на шматвяковым шляху літаратурныя першакрыніцы трансфармаваліся, а часта



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

станавіліся і непазнавальнымі. Духоўныя спевакі з”яўляліся, па словах Г.Фядотава, “пасрэднікамі паміж царквою і народам”, яны перакладалі на зразумелую народу мову тое, што найбольш уражвала іх. Выкарыстоўваючы літаратурныя крыніцы, спявак рабіў свой выбар, імкнуўся дасягнуць свайго ідэалу, які быў выкліканы сацыяльным паходжаннем прадстаўнікоў гэтай групы, і гэты ідэал, без сумневу, разумела і падтрымлівала асноўная частка насельніцтва — у сваёй большасці бедная. Права выбару і прывяло да шматлікіх (але не выпадковых) скажэнняў. І калі А.Кірпічнікаў сцвярджаў, што такія змены і дзіўныя скажэнні “трэба адкідаць ад помніка, які бытуе ў вуснай традыцыі, каб атрымаць яго літаратурнае зерне”, то сучаснаму даследчыку, наадварот, трэба адшукваць такія змены і знаходзіць прычыны, што іх выклікалі.

Сёння навука падышла да такога ўзроўню, які дазваляе даць сапраўды ўсебаковае, глыбіннае тлумачэнне і такой з’явы народнай культуры, як лірніцтва. Таму, вывучаючы гэты сацыякультурны феномен, трэба выкарыстоўваць сінтэз розных галін гуманітарных навук, сучасныя метады навуковых даследаванняў. Лічым, што на цяперашнім этапе патрэбны руплівы адбор, класіфікацыя і апісанне фальклорнага і этнаграфічнага матэрыялу па вызначанай тэме, і толькі потым, шляхам рэтраспекцыі, варта падыходзіць да высвятлення генезісу гэтага старажытнага пласта народнай культуры.

Сучасна гучыць сёння выказванне В.Баржкоўскага: “Вывучаючы духоўнае жыццё лірнікаў, іх погляды на з’явы жыцця, на грамадства, саміх сябе, на сваю дзейнасць, а таксама адносіны іх да грамадства і грамадства да іх — гэтым самым можна было б паспрыяць асвятленню значэння лірнікаў у жыцці народа” (Боржковский В. Лирники // Киевская старина. Киев, 1989. — Т. 26. — С. 675). Галоўная задача сёння — вызначыць месца ў культурна-гістарычным працэсе такой спецыфічнай з’явы народнага жыцця беларусаў, як лірніцтва.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ